*Літ.*: Ліс А. Жніўныя песні. Мінск, 1993. *Т.В.Валодзіна.*

**АПРАЦАВА́НЫ ФАЛЬКЛО́Р**, зменены, прыстасаваны, пераасэнсаваны з мэтай вырашэння творчых, выканаўчых задач фалькл. твор; тып *фальклярызму*. Апрацоўваюць часцей за ўсё муз., паэт., харэагр., драм. творы. Выканаўцы А.ф., як правіла, не з'яўляюцца носьбітамі традыцый. Гал. пры апрацоўцы фалькл. твора — захаваць асаблівасць арыгінала, яго эстэтычную прыгажосць, жанравую спецыфіку канкрэтнага мясц. стылю. Апрацоўка муз. фальклору адбываецца шляхам гарманізацыі, аранжыроўкі твораў, транскрыпцыі, уключае аркестроўкі, прыстасаваныя для выканання на інш. інструменце альбо інш. складам музыкантаў. Звычайна апрацоўваюцца песні, якія некалі былі часткай абраду, пазаабрадавыя, лірычныя, сямейныя. Якаснай лічыцца апрацоўка, якая максімальна адлюстроўвае аўтэнтычнасць твора, раскрывае магчымасці развіцця нар. меласу, адпавядае сучасным поглядам і густам людзей. Да такіх адносяцца апрацоўкі М.Аладава, А.Багатырова, К.Галкоўскага, А.Грачаніна, Л.Захлеўнага, Э.Наско, А.Прохарава, Р.Пуксга, А.Рашчынскага, Л.Смялкоўскага, Г.Цітовіча, М.Чуркіна і інш. Важнымі элементамі пры выкананні апрацаванага муз. твора з'яўляецца манера спеву, інтэрпрэтацыя песні на сцэне, паводзіны выканаўцаў, выкарыстанне пластыкі і мімікі, сцэнічныя касцюмы, жэсты, рухі, мізансцэны і інш. У сучасных умовах А.ф. — неад'емная частка муз. духоўнай культуры бел. народа.

*Літ.*: Песня: любоў і абавязак // Мастацтва Беларусі. 1985. №8. *А.М.Аляхновіч.*

**АПРАЦО́ЎКА** ў музыцы, адаптацыя арыгінальнага нотнага тэксту музычнага твора да пэўных умоў (навук. працэс, рэпертуар) або для выканання інш. складам выканаўцаў (*аранжыроўка*). А. звязана з цэлым радам змяненняў меладычна-тэматычнага матэрыялу, фактуры, формы. На першай стадыі навуч. працэсу па вакале скасоўваюцца фіярытуры, замяняюцца высокія ноты на больш нізкія, змяняюцца тэсітура, тэмбр. Затым можа быць зроблена *гарманізацыя* пратэстанцкага і грыгарыянскага харала альбо нар. аднагалосай ці з падводкай мелодыі (песні, танца) для хору, нар., сімф., духавога, эстр. аркестраў. Спрашчэнні могуць быць у нотным тэксце з улікам узроўню праф. падрыхтоўкі і выканаўчых здольнасцей музыкантаў. У залежнасці ад ступені пераўтварэння арыгінальнага нотнага матэрыялу А. набываюць выгляд *транскрыпцыі*, фантазіі, парафразы, рапсодыі, дзе змяняюцца ўсе муз. кампаненты. А. мае від аўтарскай творчай працы, якая з'яўляецца самаст. маст. каштоўнасцю. Ад спосабу пераўтварэння выканаўчага складу арыгінальнага нотнага матэрыялу А. набывае форму аранжыроўкі, сутнасць якой у змяненні выканаўчага складу арыгінала (мяшаны хор — аднародны жаночы хор, камерны аркестр — інструм. ансамбль і г.д.), пералажэння (сімф. аркестр — фп.), аркестроўкі — пералажэнне любога шматгалосага твора для аркестра. Існуе практыка А. класічнай музыкі для рок і джаз-аркестраў і вак. груп. *Т.Г.Мдывані.*

**АПСІ́ДА**, абсіда [ад грэч. hapsis (hapsidos) скляпенне], канструкцыйна самастойная частка культавай пабудовы; паўкруглы, кантаваны, прамавугольны ў плане выступ будынка або ніша, якая павялічвае прастору памяшкання. Зрэдку А. сустракаецца ў форме трохвугольніка (Святадухаўская царква ў пас. Гатава Мінскага р-на). Упершыню ўзнікла ў страж.-рымскіх свецкіх базіліках (у А. знаходзілася месца суддзі), адкуль перайшла ў хрысціянскія храмы. Найб. важная функцыя А. — завяршэнне алтарнай прасторы, якая сімвалізуе вобраз раю, духоўнага свету. Перакрываецца конхай, скляпеннем або 2—5-схільным дахам. А. могуць завяршацца ўсе *нефы* храма або цэнтр. неф і пастафорыі на У, а таксама цэнтр. неф на З (раннераманскія базілікі, якія маюць дадатковыя алтары на З) і *трансепт* на Пн і Пд. У консе звычайна размяшчаюцца фрэскі або маза́ічныя выявы Збаўцы, Багародзіцы. А. можа быць дэкарыраваная аркатурай на прыстаўленых круглых калонках або паўкалонках. Для Беларусі характэрны 1—3-апсідныя храмы, якія вядомы з 11 ст. *В.Г.Арабей.*

*Апсіда Святадухаўскай царквы ў пас. Гатава Мінскага р-на.*



**«АПУ́КА»**, народная гульня з мячом (апукай) і палкай (бітай, ракеткай). Вядома амаль ва ўсіх абласцях Беларусі. Існуе шмат варыянтаў яе назвы: «Елка», «Лавец», «Палант», «Перагон», «Ілкі», «Сам за сябе», «Пабягунка», «Салаўі», «Мячык», «Засяканка», «Хапанка», «Лавушка» і інш. У Расіі называецца «Лапта». Па правілах удзельнікі разбіваюцца на 2 каманды. Адна застаецца ў т.зв. «горадзе» (квадрат або круг дыям. 2 м), другая ідзе ў «поле». Адзін з удзельнікаў каманды «гарадскіх» падкідвае мяч, другі адбівае яго палкай як мага далей у «поле». Калі «палевікі» схопяць мяч на ляту, то каманды мяняюцца месцамі. Калі ж мяч упадзе на зямлю, то задача «палевікоў» — хутка падняць яго і паспрабаваць папасці ў каго-небудзь з удзельнікаў каманды праціўніка, якія ў гэты час бягуць да «засекі» (20—30 м у «полі»). Падобныя да А. гульні ёсць у Англіі, Аўстраліі, ЗША, Канадзе, Румыніі, Фінляндыі і інш. краінах. Гульні з «мячом» і палкамі існавалі ў страж. часы. На некаторых малюнках сярэдневяковых рукапісаў і маст.